ЗАЦВЯРДЖАЮ
Міністр інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

_______________ А.М.Карлюкевіч
«___» __________ 2018 г.

# ПАРАДАК
## акрэдытацыі прадстаўнікоў беларускіх і замежных сродкаў масавай інфармацыі на XXV Дні беларускага пісьменства 1-2 верасня 2018 года ў г. Іванава Брэсцкай вобласці

Парадак акрэдытацыі распрацаваны ў мэтах арганізацыі інфармацыйнага забеспячэння мерапрыемстваў XXV Дня беларускага пісьменства 1-2 верасня 2018 года ў г. Іванава Брэсцкай вобласці.

Акрэдытацыю прадстаўнікоў беларускіх, а таксама замежных СМІ, якія маюць акрэдытацыю Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заяўкі на акрэдытацыю, у адпаведнасці з прыкладаемай формай, за подпісам кіраўніка рэдакцыі СМІ да 27 жніўня 2018 г. накіроўваюцца ў Міністэрства інфармацыі па электронным адрасе ups@mininform.gov.by .

Выдача акрэдытацыйных бэйджаў будзе ажыццяўляцца па месцы рэгістрацыі прадстаўнікоў СМІ ў г. Іванава з 10.00 1 верасня 2018 года (Сярэдняя школа № 4 г. Іванава, вул. Савецкая, 78).

Праезд і знаходжанне ў г. Іванава – за кошт накіроўваючага боку.

Для атрымання бэйджа неабходна:

для прадстаўнікоў беларускіх СМІ – дакумент, які сведчыць асобу (службовае пасведчанне і пашпарт),

для прадстаўнікоў замежных СМІ – акрэдытацыйную карту МЗС Рэспублікі Беларусь і пашпарт.